Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Франциска Скарыны”

**Т. А. ФІЦНЕР**

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НАШАНІЎСКАГА ПЕРЫЯДУ

Практычны дапаможнік

для студэнтаў спецыяльнасці
1-02 03 03 “Беларуская мова і літаратура.
Замежная мова (англійская)”

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2024

УДК 821.161.3’06(076)
ББК 83.3(4Беі)6я73
Ф666

Рэцэнзенты:
кандыдат філалагічных навук М. У. Буракова,
кандыдат філалагічных навук Л. В. Паплаўная

Рэкамендавана да выдання
навукова-метадычным саветам установы адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

**Фіцнер, Т. А.**

Ф666 Гісторыя беларускай літаратуры Нашаніўскага перыяду : практычны дапаможнік / Т. А. Фіцнер ; Гомельскі дзярж. ўн-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2024. – 47 с.
ISBN 978-985-32-0006-5

Практычны дапаможнік прызначаны для аказання дапамогі студэнтам пры выкананні заданняў па тэмах, што вывучаюцца ў межах дысцыпліны. У ім змешчаны тэмы практычных, пытанні да іх і дадатковая літаратура для падрыхтоўкі да заняткаў, індывідуальныя заданні і тэсты для падрыхтоўкі да экзамена; тлумачацца крытэрыі выстаўлення балаў, падаюцца рэкамендацыі па выкананні індывідуальных заданняў.

Прызначан студэнтам 2 курса спецыяльнасці 1-02 03 03 “Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)”.

**УДК 821.161.3’06(076)**
**ББК 83.3(4Беі)6я73**

**ISBN 978-985-32-0006-5**

© Фіцнер Т. А., 2024
© Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”, 2024

# ЗМЕСТ

Прадмова………………………………………………………………... 4
Пытанні і заданні да практычных заняткаў………………………... 5
Тэсты для самакантролю……………………………………………. 23
Літаратура……………………………………………………………. 46

# ПРАДМОВА

Дысцыпліна дзяржаўнага кампанента “Гісторыя беларускай літаратуры Нашаніўскага перыяду” (Модуль “Гісторыя беларускай літаратуры – 2”) вывучаецца студэнтамі 2 курса спецыяльнасці 1-02 03 03 “Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)” і ўваходзіць у сістэму літаратуразнаўчай падрыхтоўкі студэнтаў, якія вывучаюць гісторыю беларускай літаратуры ў якасці будучай спецыяльнасці. “Гісторыя беларускай літаратуры Нашаніўскага перыяду” – дысцыпліна, якая асвятляе заканамернасці гісторыка-літаратурнага працэсу пачатку ХХ ст., яго канкрэтныя праявы, важнейшыя тэндэнцыі, станаўленне творчых метадаў і мастацкіх стыляў, жанраў, месца пісьменніка і асобных твораў у літаратурным працэсе.

Веды, якія студэнты мусяць набыць пры вывучэнні курса, паспрыяюць у далейшым высокапрафесійнай працы ў разнастайных навучальных установах (вышэйшых у тым ліку), а таксама ў магчымай навукова-даследчай дзейнасці.

Мэта дысцыпліны – даць аптымальны аб’ём ведаў па гісторыі беларускай літаратуры Нашаніўскага перыяду ў кантэксце сацыяльна-гістарычных і агульнакультурных заканамернасцей грамадскага развіцця, выявіць ролю і значэнне знакавых постацей у гісторыі развіцця айчыннай літаратуры, спрыяць далейшай выпрацоўцы навыкаў прафесійнага літаратуразнаўчага аналізу; сфарміраваць у студэнтаў-філолагаў сістэму прафесійных ведаў і ўменняў, што забяспечыць самастойную творчую дзейнасць настаўніка-славесніка.

Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя беларускай літаратуры Нашаніўскага перыяда” цесна звязана з такімі дысцыплінамі, як “Тэорыя літаратуры”, “Гісторыя рускай літаратуры”, “Гісторыя замежнай літаратуры”, “Літаратура бліжняга замежжа”.

Дапаможнік накіраваны на сістэматызацыю ведаў студэнтаў адносна спецыфікі развіцця беларускай літаратуры пачатку ХХ ст.

# ПЫТАННІ І ЗАДАННІ
# ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## Практычныя заняткі 1

## Тэма: *«Нашаніўскі» перыяд. Агульная характарыстыка*

1 Беларуская літаратура і агульнаеўрапейскі гістарычны працэс.

2 Штотыднёвік "Наша доля" і газета "Наша ніва"; дыскусія 1913 г. аб шляхах развіцця беларускай літаратуры.

3 Эстэтычная шматграннасць беларускай літаратуры пачатку ХХ ст.

4 Масавая беларуская літаратура пачатку ХХ ст.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і прачытаць з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры крытычныя артыкулы.

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск : Бел навука, 2001. – 386 с.

2 Казбярук, У. М. На хвалі беларускага адраджэння. Беларуская літаратура пачатку ХХ ст. / У. М. Казбярук // Роднае слова. – 1993. – № 5, 7.

3 Максімовіч, В. А. Эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры пачатку ХХ ст .: дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ / В. А. Максімовіч. – Мінск, 2000.

4 Навойчык, П. Дзве плыні ў "нашаніўскім руху" / П. Навойчык // Роднае слова. – 1993. – № 9, 10, 12.

5 "Наша ніва" // Крыніца. – 2000. – № 11–12 (60). – С. 133–235.

### *Індывідуальныя заданні*

1 Вызначце ролю газеты "Наша доля" ў развіцці беларускай літаратуры пачатку ХХ ст.

2 Вызначце ролю газеты "Наша ніва" ў развіцці беларускай літаратуры пачатку ХХ ст.

3 Чаму перыяд развіцця айчыннай літаратуры пачатку ХХ ст. называюць Нашаніўскім? Каму належыць аўтарства?

4 Чаму была прысвечана дыскусія 1913 г. на старонках газеты "Наша ніва" і што яе справакавала?

5 Хто і якім артыкулам распачаў дыскусію 1913 г. на старонках газеты “Наша ніва”?

6 Хто прыняў удзел у дыскусіі 1913 г. на старонках газеты “Наша ніва”?

7 Чаму беларускую літаратуру пачатку XX ст. даследчыкі вызначаюць як “масавая”? У чым гэта праявілася?

# ПІСЬМЕННІКІ-ПАЧЫНАЛЬНІКІ НАВЕЙШАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## Практычныя заняткі 2
## Тэма: *Ядвігін Ш.*

1 Біяграфія пісьменніка.
2 Ідэйна-мастацкі змест зборнікаў прозы “Бярозка” і “Васількі”.
3 “Золата” як адзін з першых буйных твораў беларускай прозы.
4 Паэма “Дзед Завала”, нарысы, успаміны, артыкулы.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і прачытаць з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры крытычныя артыкулы; прачытаць творы Ядвігіна Ш. (апавяданні: “Падласенькі”, “Вучоны бык”, “Бярозка”, “Зарабляюць”, “Гаротная”, “Гадунец”, “Заведзеная надзея”; лірычную прозу: “Васількі”, “Раны”; раман “Золата”).

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Верціхоўская, М. “Зрячій посох”, або Спроба прачытаць Ядвігіна Ш. / М. Верціхоўская, В. Цялкова // Роднае слова. – 1997. – № 4. – С. 92.

2 Максімовіч, В. А. “Алегарычнае” апавяданне Ядвігіна Ш. / В. А. Максімовіч // Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пач. XX стагоддзя. – Мінск, 2000. – С. 145–155.

3 Содаль, У. Пачынальнік. Да 140-й гадавіны з дня нараджэння Ядвігіна Ш. / У. Содаль // Полымя. – 2009. – № 1 – С. 181–182.

4 Ткачова, П. Жанравая спецыфіка твораў Ядвігіна Ш. / П. Ткачова // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 2 – С. 48.

5 Ядвігін, Ш. Творы. [Электронны рэсурс] / Ш. Ядвігін // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Jadvihin_S/. – Дата доступа: 10.11.2023.

### *Індывідуальныя заданні*

1 Чаму даследчыкі вызначаюць апавяданні Ядвігіна Ш. як алегарычныя? Дакажыце на прыкладах.

2 Прааналізуйце апавяданні, прысвечаныя "жаночай долі" ("Бярозка", "Зарабляюць", "Гаротная").

3 Абгрунтуйце назву рамана "Золата".

4 Прааналізуйце вобраз Зосі Стрончык з рамана "Золата".

5 Дайце характарыстыку вобразу Васіля Дубінскага з рамана "Золата".

6 Раман "Золата" лічыцца няскончаным, дапішыце яго фінал.

7 Вызначце ўнёсак Ядвігіна Ш. у развіццё айчыннага прыгожага пісьменства.

## Практычныя заняткі 3
## Тэма: *Цётка* (*Алаіза Пашкевіч*)

1 Біяграфія, творчая і грамадская дзейнасць.

2 Паэзія Цёткі: традыцыі і наватарства.

3 Проза і публіцыстыка Цёткі.

4 Значэнне дзейнасці Цёткі ў развіцці беларускай культуры і літаратуры.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і прачытаць з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры крытычныя артыкулы; прачытаць творы Цёткі (вершы са зборнікаў "Скрыпка беларуская" і "Хрэст на свабоду"; апавяданні "Прысяга над крывавымі разорамі", "Лішняя", "Зялёнка", "Асеннія лісты", "Міхаська"; публіцыстыка "З дарогі", "Успаміны з паездкі ў Фінляндыю" (на выбар)).

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя... / І. Э. Багдановіч // Дзве стыхіі ў творчасці Цёткі. – Мінск : Беларуская навука, 2001. (Раздзел: "Дзве стыхіі ў творчасці Цёткі"). – С. 130–149.

2 Коўтун, В. На касмічнай карце бацькаўшчыны (з радаводу Цёткі) / В. Коўтун // Роднае слова. – 1998. – № 12. – С. 165–171.

3 Коўтун, В. Стала песняю ў народзе. Асоба і творчасць Цёткі ў кантэксце станаўлення беларускай класікі / В. Коўтун. – Мінск : Народная асвета, 2000. – 143 с.

4 Максімовіч, В. А. Творчасць Цёткі (А. Пашкевіч) у грамадска-культурным кантэксце пачатку XX ст. // В. А. Максімовіч // Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. – Мінск, 2000. – С. 228–260.

5 Петрушкевіч, А. М. Некаторыя старонкі беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя : дапам. / А. М. Петрушкевіч; пад рэд. І. В. Жука. – Гродна : ГрДУ, 2009. – 147 с.
6 Сабуць, А. Э. “Лучынка” Алаізы Пашкевіч злучыла эпохі. Да 100-годдзя выдання / А. Э. Сабуць // Роднае слова. – 2014. № 4. – С. 13–18.
7 Цётка. Творы [Электронны рэсурс] / Цётка // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Ciotka/. – Дата доступа: 10.11.2023

***Індывідуальныя заданні***

1 Пацвердзіце ці аспрэчце наступнае сцвярджэнне М. Ермаловіча: “Цётка як бы аб’ядноўвала ў сабе дзвюх выдатных жанчын нашай старажытнасці: Рагнеду і Ефрасінню Полацкую...”
2 Традыцыі якога паэта працягвае Цётка ў сваёй лірыцы? Дакажыце.
3 Цётка як даследчыца ўнутранага свету, псіхалогіі герояў, іх трагічнай экзістэнцыі (дакажыце на прыкладзе аднаго з апавяданняў: “Лішняя”, “Зялёнка”, “Асеннія лісты”).
4 Прааналізуйце вобраз Міхаські з аднайменнага апавядання. Чаму вучыць гэты твор?
5 Чым выкліканы падарожжы Цёткі ў Фінляндыю і Швецыю? Чым дзеліцца пісьменніца з чытачом (на прыкладзе аднаго з прапанаваных у *заданні* публіцыстычных твораў)?

## Практычныя заняткі 4
## Тэма: *Вацлаў Ластоўскі*

1 Біяграфія пісьменніка.
2 Разнастайнасць тэматыкі і жанрава-стылёвых форм у прозе В. Ластоўскага.
3 Аповесць “Лабірынты”: спецыфіка мастацка-філасофскага ўвасаблення ідэі беларускага нацыянальнага быцця.
4 Роля В. Ластоўскага ў станаўленні нацыянальнай крытыкі і публіцыстыкі.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і прачытаць з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры крытычныя артыкулы; прачытаць творы В. Ластоўскага (вершы: “На Радуніцу”, “На Каложы ў Гародні”, “Дума на Полацкім замчышчы”, “Баяну”; апавяданні: “Лебядзіная песня”, “Панас гуляе”, “Мост у Кутах”; “Сож і Няпро”, “Разбойнік”, “Вітаўт і Ягайла”, “Каменная труна”, “Дзень ружавай кветкі”; імпрэсіі “Слёзы”,

“Мары”, “Краскі”, “Апаўшае лісце”; аповесці “Прыгоды Панаса і Тараса” і “Лабірынты”; рэцэнзіі на зборнікі “Васількі” Ядвігіна Ш., “Рунь” М. Гарэцкага, “Родныя з’явы” Т. Гушчы-Коласа).

**Дадатковая літаратура да практычных**


1 Бугаёў, Дз. Пра Вацлава Ластоўскага / Служэнне Беларусі / Дз. Бугаёў. – Мінск : Маст. літ., 2003. – С. 31–48.

2 Васючэнка, П. В. Захоплены лабірынтам: Таямніцы творчасці Вацлава Ластоўскага / П. В. Васючэнка // Роднае слова. – 2008. – № 11. – С. 3–6.

3 Васючэнка, П. В. Першаадкрывальнік з роду Ластаў. Мастацкія адкрыцці Вацлава Ластоўскага / Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. В. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – С. 53–62.

4 Шамякіна, Т. “Лабірынты” Вацлава Ластоўскага і навуковыя пошукі XX–XXI стагоддзяў / Т. Шамякіна // Маладосць. – 2008. – № 10. – С. 103–110.

5 Ластоўскі, В. Творы [Электронны рэсурс] / В. Ластоўскі. Беларуская палічка: Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Vaclau_Lastouski/. – Дата доступа: 10.11.2023.


***Індывідуальныя заданні***

1 Дакажыце ці аспрэчце наступнае меркаванне: “Апавяданне В. Ластоўскага “Дзень ружавай кветкі” адносіцца да рэалістычнага кірунку”.

2 Як склаўся лёс галоўнага героя апавядання “Лебядзіная песня”? Чаму? Адказ абгрунтуйце.

3 Якую загану выкрывае аўтар у апавяданні “Панас гуляе”?

4 Зрабіць пісьмовае паведамленне-разважанне на тэму “Жанравая адметнасць аповесці В. Ластоўскага “Лабірынты” з пункту гледжання сучаснага айчыннага літаратуразнаўства.

5 Патлумачце фінал аповесці “Лабірынты”. Чаму аўтар так заканчвае твор?

6 В. Ластоўскі-крытык (прааналізаваць – на выбар – адну з рэцэнзій пісьменніка, адзначаных у *заданні*).

## Практычныя заняткі 5
## Тэма: *Змітрок Бядуля*

1 Біяграфія: умовы фарміравання і асаблівасці таленту.

2 Паэзія З. Бядулі “нашаніўскага” перыяду і 20-х гг. (зборнік “Пад родным небам”); лірычныя імпрэсіі (зборнік “Абразкі”); апавяданні 1912–1915 гг.

3 Апавяданні 20-х гг.; аповесць “Салавей” і аўтабіяграфічныя аповесці “Набліжэнне” і “У дрымучых лясах”.

4 “Язэп Крушынскі” як сацыяльна-псіхалагічны раман; праблематыка, сістэма вобразаў.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і прачытаць з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры крытычныя артыкулы; зборнікк “Абразкі” (некалькі мініяцюр на выбар), пяць апавяданняў (“Пяць лыжак заціркі”, “Малыя дрывасекі”, “Велікодныя яйкі”, “На каляды к сыну”, “Летапісцы”, “Ашчаслівіла” – можна іншыя), аповесць “Салавей”, аўтабіяграфічную аповесць “У дрымучых лясах”; аповесць-казку “Сярэбраная табакерка”, раман “Язэп Крушынскі” (адну кнігу).

## Дадатковая літаратура да практычных

1 Каваленка, В. Бядуля або згублены класік / В. Каваленка // ЛіМ. – 1994. – 23 снежня. – С. 6–7.

2 Каваленка, В. Самаразбурэнне ці Скамечаны лёс / В. Каваленка // Маладосць. – 1995. – № 10. – С. 242–251.

3 Кульбянкова, І. М. Ад сусветнай тугі да веры ў беларускі шлях. Паэзія Зм. Бядулі 1914–1919 гг. / І. М. Кульбянкова // Роднае слова. – 2000. – № 11. – С. 3–8.

4 Мельнікава, З. П. “На горне душы...”: творчасць Змітрака Бядулі і беларуская літаратура першай трэці XX ст. / З. П. Мельнікава. – Брэст : БДУ імя А. С. Пушкіна, 2001. – 222 с.

5 Стральцоў, М. Л. З плеяды першых / М. Л. Стральцоў // Выбранае : проза, паэзія, эсэ / Міхась Стральцоў. Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. – С. 506–512.

6 Бядуля, Зм. Творы [Электронны рэсурс] / Зм. Бядуля // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Zmitrok_Biadula/. – Дата доступа: 10.11.2023.

## *Індывідуальныя заданні*

1 Ахарактарызуйце вершы З. Бядулі (два–тры на выбар), прысвечаныя Першай сусветнай вайне (“Ад крыві чырвонай”, “Не мы...”, “Вайна”, “... І сотнямі тысяч...”, “Юда жэніцца...”, “То не хаты, а курганы...”, “Сухавеі”, “Ты слязамі і крыжамі...”).

2 Дайце азначэнне мініяцюры, прааналізуйце мініяцюры З. Бядулі, прысвечаныя “жаночай долі” (“Плач пралескаў”, “Снілася мне казка...”, “Шчасце не ў золаце”, “Маці” і інш.).

3 Дайце агульную характарыстыку апавяданняў З. Бядулі 1912–1915 гг.

4 Якую праблему асэнсоўвае аўтар у апавяданні “Велікодныя яйкі”?

5 Як вырашаецца праблема “бацькоў і дзяцей” у апавяданні “На каляды к сыну”?

6 Які перыяд жыцця пісьменніка ахоплівае аўтабіяграфічная аповесць “У дрымучых лясах”? Якія эпізоды вам найбольш запомніліся?

7 Язэп Крушынскі герой ці антыгерой? Адказ абгрунтуйце.

## Практычныя заняткі 6
## Тэма: *Алесь Гарун*

1 Біяграфія паэта: асноўныя перыяды жыцця і творчасці.

2 Зборнік “Матчын дар” як найбольш поўная мастацкая выява творчай індывідуальнасці паэта; вершы 1917–1920 гг.

3 Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў А. Гаруна.

4 Дзіцячая драматургія (зборнік “Жывыя казкі”).

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і прачытаць з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры артыкулы (крытычныя, успаміны сучаснікаў); прачытаць паэтычны зборнік “Матчын дар”, пяць апавяданняў (“Першы снег”, “Пан Шабуневіч”, “П’ера і Каламбіна”, “Свята”, “Чалавек без крыві” – можна іншыя), адну п’есу на выбар са зборніка “Жывыя казкі”.

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Васючэнка, П. В. Ад тэксту да хранатопа : артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. В. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 200 с.

2 Гарун, А. Сэрцам пачуты звон. Паэзія, проза, драматургія, Публіцыстыка / А. Гарун. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 359 с.

3 Казбярук, У. М. Церневыя і лаўровыя вянкі Алеся Гаруна / У. М. Казбярук // Гарун, А. Сэрцам пачуты звон. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 5–28.

4 Клікуноў, А. Адвечны крыж. Спроба разгляду паэтычнай спадчыны А. Гаруна ў кантэксце хрысціянскага светаўспрымання / А.Клікуноў // Роднае слова. – 1999. – № 1.

5 Марціновіч, А. Шляхам праўды / А. Марціновіч. – Мінск, 1994. – С. 91–94.

6 Рагойша ,У. Этапы Алеся Гаруна / У. Рагойша // Полымя. – 1990. – № 7. – С. 220–230.

7 Гарун, А. Творы [Электронны рэсурс] / А. Гарун // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Ales_Harun/. – Дата доступа: 10.11.2023.

***Індывідуальныя заданні***

1 Напішыце Водгук на верш А. Гаруна “Nokturno”.

2 Вызначце асноўныя тэмы лірыкі А. Гаруна ў зборніку “Матчын дар”.

3 Чаму П. Васючэнка (гл. кнігу “Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы”) называе А. Гаруна нóчным паэтам?

4 Ахарактарызуйце вобраз галоўнага героя з апавядання “Свята”. Час і прастора ў творы.

5 Асэнсаванню якой праблемы прысвечана апавяданне “П’ера і Каламбіна”.

6 Чаму вучаць і што выхоўваюць “Жывыя казкі” А. Гаруна? Адказ падмацуйце прыкладамі з твораў.

## Практычныя заняткі 7
## Тэма: *Цішка Гартны*

1 Асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага.

2 Празаічныя творы: аналіз зборнікаў.

3 Раман “Сокі цаліны”, яго значэнне для беларускай раманістыкі.

4 Драмы Ц. Гартнага.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю Ц. Гартнага (апавяданнямі са зборнікаў “Трэскі на хвалях” (1923) і “Прысады” (1927) – прачытаць (тры–пяць на выбар “Трэскі на хвалях”, “Спатканне”, “Штрэйкбрэхер”, “Распусніца”, “Свае блінцы”, “Больш за ўсіх”), раманам “Сокі цаліны” (першая квадра “Бацькава воля”)).

**Дадатковая літаратура да практычных**

1 Гартны, Ц. Абеглы саманарыс майго жыцця / Ц. Гартны // Пяцьдзесят чатыры дарогі: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск : ДВБ, 1963. – С. 133–136.

2 Гартны, Ц. [Электронны рэсурс] / Ц. Гартны // Беларускія пісьменнікі: 1917–1990. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – С. 42–43. – Рэжым доступа: https://www.rulit.me/books/belaruskiya-pismenniki-1917-1990-read-442013-42.html. – Дата доступа: 10.11.2023.

3 Гартны, Ц. Творы (выбраныя апавяданні і збор твораў, Т. 1–3) [Электронны рэсурс] / Ц. Гартны // Беларуская палічка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Ciska_Hartny/. – Дата доступа: 10.11.2023.

***Індывідуальныя заданні***

1 Прааналізуйце апавяданне “Штрэйкбрэхер” / “Распусніца” (на выбар). Асуджаеце вы герояў за іх учынкі ці спачуваеце ім? Адказ абгрунтуйце.

2 Як вы разумееце назву апавядання “Больш за ўсіх”? Каго з герояў твора яна характарызуе?

3 Дайце характарыстыку вобраза Рыгора Нязвычнага / Васіля Берага (на выбар) з рамана “Сокі цаліны”.

4 Дайце характарыстыку вобраза Зосі Прыдатнай з рамана “Сокі цаліны”.

5 Чаму першая квадра рамана “Сокі цаліны” называецца “Бацькава воля”? Абгрунтуйце.

6 Вызначце ўклад Ц. Гартнага ў развіццё беларускай літаратуры.

# ТВОРЧАСЦЬ ПІСЬМЕННІКАЎ-КЛАСІКАЎ

## Практычныя заняткі 8
## Тэма: *Янка Купала*

1 Біяграфія; набыткі і дасягненні купалазнаўства.

2 Мастацкая эвалюцыя Я. Купалы ў зборніках “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”, “Спадчына”.

3 Рамантычныя паэмы 1910–1913 гг., іх мастацкія адметнасці.

4 Драматычныя паэмы: праблематыка, мастацкія асаблівасці.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю Я. Купалы (паэтычныя зборнікі “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”, “Спадчына”; раннія паэмы: “Зімою”, “Калека”, “Нікому”, “Адплата кахання”, “У піліпаўку”, “За што?” (тры на выбар); драматычныя паэмы “Адвечная песня”,“Сон на кургане”; паэмы: “На куццю”, “На дзяды”, “Курган”, “Бандароўна”, “Магіла льва”, “Яна і я”).

**Дадатковая літаратура да практычных**

1 Ваданосава, Ф. “Гэй, да сонца, гэй, да зор!”: Да 80-годдзя з дня выхаду ў свет зборніка Я. Купалы “Шляхам жыцця” / Ф. Ваданосава // Роднае слова. – 1993. – № 4.

2 Ваданосава, Ф. “Грай, мая жалейка...”: Да 90-годдзя першага зборніка вершаў Я. Купалы / Ф. Ваданосава // Роднае слова. – 1998. – № 6. – С. 199–206.

3 Навуменка, І. На пераломе эпох: творчасць Я. Купалы (зборнік “Гусляр”, 1910) / І. Навуменка // Роднае слова. – 1995. – № 7.

4 Рагойша, В. Бацька нацыі / В. Рагойша // Полымя. – 1992. – № 6.

5 Санюк, Дз. “Не хачу весяліцца, гуляць”: Трагедыйнасць дакастрычніцкай творчасці Я. Купалы / Дз. Санюк // Роднае слова. – 1992. – № 1.

6 Купала, Я. Творы [Электронны рэсурс] / Я. Купала // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Janka_Kupala/. – Дата доступа: 10.11.2023.

***Індывідуальныя заданні***

1 Прааналізуйце інтымную лірыку Я. Купалы: “Даўгажданая”, “Явар і каліна”, “Пакахай мяне, дзяўчынка”, “Як у лесе зацвіталі”, “З недацветаў”, “Над ракою ў спакою”, “Песня” (“Зайшло ўжо сонейка, цень лёг на гонейка...”), “Мая жонка”, “Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея...”, “А яна...” і інш. – тры вершы на выбар.

2 Ахарактарызуйце вобраз Машэкі з паэмы Я. Купалы “Магіла льва”. Што легла ў аснову твора Я. Купалы?

3 Што адстойвае Гусляр з паэмы “Курган”? Ці пагаджаецеся вы з яго выбарам?

4 Што аб’ядноўвае рамантычныя паэмы Я. Купалы 1910–1913 гг.?

5 Ахарактарызуйце вобраз Бандароўны з аднайменнай паэмы. Што легла ў аснову твора Я. Купалы?

6 Пацвердзіце ці аспрэчце, што ў вобразе Мужыка (паэма “Адвечная песня”) ўвасоблена ўніверсальнасць чалавечага лёсу; абгрунтуйце вызначэнне даследчыкамі твора як “містэрыі”.

7 Ахарактарызуйце вобраз Сама з драматычнай паэмы “Сон на кургане”. Што сніць герой і калі ён прачынаецца?

## Практычныя заняткі 9
## Тэма: *Янка Купала*

1 Камедыя “Паўлінка”: праблематыка і вобразы, камедыйнае і драматычнае ў п’есе.

2 “Раскіданае гняздо” як драма ідэй: аўтабіяграфічная аснова, сацыяльна-філасофскі і сімвалічны характар п’есы.

3 Трагікамедыя “Тутэйшыя”: праблематыка і жанравая адметнасць.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і драматургічнай творчасцю Я. Купалы (п’есы: “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”, “Тутэйшыя”; прачытаць (і выпісаць па некалькі тэзісаў) з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры крытычныя артыкулы (на выбар).

## Дадатковая літаратура да практычных

1 Васючэнка, П. В. Драматургічная спадчына Янкі Купалы / П. В. Васючэнка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 174 с.

2 Васючэнка, П. В. Я. Купала і сімвалізм / П. В. Васючэнка // Роднае слова. – 2002. – № 8.

3 Васючэнка, П. В. Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. В. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 200 с.

4 Санюк, Зм. Харызматычны статус творчасці Янкі Купалы / Зм. Санюк // Роднае слова. – 2000. – № 1.

5 Купала, Я. Творы [Электронны рэсурс] / Я. Купала // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Janka_Kupala/. – Дата доступа: 10.11.2023.

## *Індывідуальныя заданні*

1 Ахарактарызуйце вобраз Паўлінкі з аднайменнай камедыі Я. Купалы. Патлумачце фінальную сцэну п’есы.

2 Ці імпануе вам Якім Сарока? Адказ абгрунтуйце.

3 Чаму Сцяпану Крыніцкаму не падабаецца Якім Сарока ў якасці будучага зяця?

4 Пацвердзіце ці аспрэчце наступнае сцвярджэнне П. Васючэнкі пра п’есу Я. Купалы “Раскіданае гняздо”: “У першым акце – *трагедыя,* у чатырох астатніх – *драма*; такая складаная жанравая прырода купалаўскага твора”.

5 Ці ўхваляеце вы выбар Лявона Зябліка з драмы “Раскіданае гняздо”?

6 Выбар каго з герояў “Раскіданага гнязда” вам найбольш блізкі? Абгрунтуйце.

7 Чаму Я. Купала вызначыў жанр “Тутэйшых” як “трагічна-смяшлівыя сцэнкі”? Абгрунтуйце.

8 Вызначце праблематыку п’есы “Тутэйшыя”.

## Практычныя заняткі 10
## Тэма: ***Якуб Колас***

1 Біяграфія, крытычныя і літаратуразнаўчыя працы аб жыцці і творчасці пісьменніка.

2 Лірыка Я. Коласа: асноўны пафас, этапы развіцця, мастацкія асаблівасці.

3 Паэма “Новая зямля”: творчая гісторыя, аўтабіяграфічная аснова, праблематыка, жанравыя асаблівасці, ідэйны змест, сэнс назвы.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю Я. Коласа (паэтычныя зборнікі “Песні жальбы”, “Водгулле”; апавяданні: “Нёманаў дар”, “Малады дубок”, “Соцкі падвёў”, “Пісаравы імяніны”, “Недаступны” і інш.; паэмай “Новая зямля”).

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Багдановіч, І. Э. Купалаўскі і коласаўскі канцэпты свабоды / І. Э. Багдановіч // Авангард і традыцыя. Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. – Мінск : Беларуская навука, 2001.

2 Максімовіч, В. А. Касмічны лад “Новай зямлі” / В. А. Максімовіч // Полымя. – 2002. – № 2.

3 Мушынскі, М. “Яна – асноўная паэма ва ўсёй маёй паэтычнай творчасці”. “Новая зямля” Я. Коласа / М. Мушынскі // Роднае слова. – 2001. – № 1.

4 Сіцька, З. Думка з-пад сэрца. “Новая зямля” ў прасторы і часе мікра- і макракосмасу / З. Сіцька // Роднае слова. – 1998. – № 5.

5 Колас, Я. Творы [Электронны рэсурс] / Я. Колас // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Jakub_Kolas/. – Дата доступа: 10.11.2023.

### *Індывідуальныя заданні*

1 Структура і тэматыка вершаў паэтычнага зборніка Я. Коласа “Песні жальбы”.

2 Прааналізуйце вобраз Андрэя Плеха з апавядання “Малады дубок”. Якую праблему ўздымае аўтар у творы?

3 Якую загану высмейвае Я. Колас у апавяданні “Недаступны”?

4 Што зрабіў мэтай свайго жыцця Міхал з паэмы “Новая зямля”? Чаму?

5 Ахарактарызуйце вобраз дзядзькі Антося (“Новая зямля”).

6 Як вырашаецца ў паэме праблема выхавання дзяцей (“Новая зямля”)?

7 Ахарактарызуйце вобраз Ганны (“Новая зямля”).

## Практычныя заняткі 11
## Тэма: *Якуб Колас*

1 Паэма “Сымон-музыка”: творчая гісторыя, характар аўтабіяграфізму.

2 Філасофская праблематыка і алегарычнасць “Казак жыцця”.

3 Трылогія “На ростанях”: творчая гісторыя, кампазіцыя, жанравыя асаблівасці; аўтабіяграфічнасць твора, праблематыка.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю Я. Коласа (паэмай “Сымон-музыка”; “Казкамі жыцця” (пяць на выбар); трылогіяй “На ростанях”); прачытаць (і выпісаць па некалькі тэзісаў) з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры крытычныя артыкулы.

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Мушынскі, М. Паэма Я. Коласа “Сымон-музыка” / М. Мушынскі // Роднае слова. – 2000. – № 5, 6.

2 Навуменка, І. Я. “Казкі жыцця” Я. Коласа / І. Я. Навуменка // Роднае слова. – 2002. – № 8, 9.

3 Шамякіна, Т. Вобраз музыкі ў беларускай літаратуры: паводле паэмаў Янкі Купалы “Курган” і Якуба Коласа “Сымон-музыка” / Т. Шамякіна // Роднае слова. – 1992. – № 12.

4 Колас, Я. Творы [Электронны рэсурс] / Я. Колас // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Jakub_Kolas/. – Дата доступа: 10.11.2023.

### *Індывідуальныя заданні*

1 У чым адметнасць вобраза Сымона ў кантэксце вобразаў мастакоў айчыннай літаратуры (“Музыка” М. Багдановіча, “Курган” і “Раскіданае гняздо” Я. Купалы)?

2 Што яднае вобразы Костуся з паэмы Я. Коласа “Новая зямля” і Сымона з паэмы “Сымон-музыка”?

3 Прааналізуйце адну з прапанаваных “казак жыцця” Я. Коласа (“Зло не заўсёды зло”, “Адзінокае дрэва”, “Балотны агонь”, “Як птушкі дуб ратавалі”, “Камень”).

4 Дакажыце ці аспрэчце наступнае меркаванне: трылогія Я. Коласа "На ростанях" – твор аўтабіяграфічны.

5 Ахарактарызуйце вобраз Лабановіча з трылогіі "На ростанях".

6 Ахарактарызуйце вобраз Ядвісі (на выбар) з трылогіі "На ростанях".

## Практычныя заняткі 12
## Тэма: *Максім Багдановіч*

1 Біяграфія паэта, вытокі яго творчасці, значэнне дзейнасці.

2 Мастацкая канцэпцыя кнігі паэзіі "Вянок".

3 Праблематыка, ідэйна-мастацкая канцэпцыя твораў, якія не ўвайшлі ў зборнік "Вянок".

4 Лірыка 1914–1916 гг. і паэзія апошняга перыяду (канец 1916 – пачатак 1917 гг.).

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю М. Багдановіча (паэтычны зборнік "Вянок"; лірыка апошніх гадоў); прачытаць (і выпісаць па некалькі тэзісаў) з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры крытычныя артыкулы.

### Дадатковая літаратура да практычных


1 Петрушкевіч, А. Палыновая горыч кахання. Максім Багдановіч і Ганна Какуева / А. Петрушкевіч // Маладосць. – 2011. – № 12. – С. 83–85.

2 Тарасюк, Л. Пад зоркай Венеры: лірыка кахання ў паэзіі М. Багдановіча / Л. Тарасюк // Роднае слова. – 1997. – № 4.

3 Чабан, Т. Космас "Вянка" / Т. Чабан // Полымя. – 1991. – № 12.

4 Васючэнка, П. В. Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. В. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 200 с.

5 Багдановіч, М. Творы [Электронны рэсурс] / М. Багдановіч // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Maksim_Bahdanovic/. – Дата доступа: 10.11.2023.


### *Індывідуальныя заданні*

1 На прыкладзе такіх твораў, як вершаванае апавяданне "У вёсцы", паэма "Вераніка" і верша-песні "Ізноў пабачыў я сялібы...") давесці асноўную думку раздзела "Мадонны" са зборніка "Вянок".

2 Дайце агульную характарыстыку зборніка "Вянок".

3 Прывесці прыклады філасофскай лірыкі М. Багдановіча, на прыкладзе аднаго верша (на выбар) патлумачыць, як вы разумееце яго сэнс.

4 Дакажыце або аспрэчце наступнае сцвярджэнне: М. Багдановіч – заснавальнік паэзіі “чыстай красы”.

5 Дакажыце або аспрэчце наступнае сцвярджэнне: М. Багдановіч – пачынальнік урбаністычнай паэзіі ў айчыннай літаратуры.

## Практычныя заняткі 13
## Тэма: *Максім Багдановіч*

1 Проза М. Багдановіча.

2 М. Багдановіч – як літаратуразнаўца і крытык.

3 Асэнсаванне мастацкіх набыткаў і праблем развіцця беларускай літаратуры (артыкулы “Глыбы і слаі”, “За тры гады”, “Забыты шлях”).

4 М. Багдановіч-перакладчык.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і творчасцю М. Багдановіча (апавяданні “Музыка”, “Апокрыф”, “Апавяданне аб іконніку і залатару”, “Шаман” і інш.); заканспектаваць крытычныя артыкулы: “Глыбы і слаі”, “За тры гады”, “Забыты шлях”.

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Гніламёдаў, У. Яго жыццёвая сіла / У. Гніламёдаў // Полымя. – 1992. – № 4.

2 Конан, Ул. Святло паэзіі і цені жыцця / Ул. Конан. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 208 с.

3 Стральцоў, М. Загадка Багдановіча / М. Стральцоў // Выбранае. – Мінск, 1987.

4 Багдановіч, М. Творы [Электронны рэсурс] / М. Багдановіч // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Maksim_Bahdanovic/. – Дата доступа: 10.11.2023.

### *Індывідуальныя заданні*

1 Прааналізаваць прытчу М. Багдановіча “Апокрыф”. Што сімвалізуе кветка-васілёк у творы?

2 Вызначце асноўную тэму твора “Апавяданне аб іконніку і залатару”.

3 Як ацэньваў творчасць Я. Купалы і Я. Коласа ў артыкуле “Глыбы і слаі” Багдановіч-крытык?

4 Як ацэньваў творчасць Я. Купалы і Я. Коласа ў артыкуле “За тры гады” Багдановіч-крытык?

5 Значэнне перакладчыцкай дзейнасці М. Багдановіча.

## Практычныя заняткі 14
## Тэма: *Максім Гарэцкі*

1 Біяграфія, асноўныя перыяды творчасці, мастацка-светапоглядныя прынцыпы.

2 Апавяданні М. Гарэцкага: разнастайнасць тэматыкі і жанравастылёвых форм.

3 Гарэцкі-драматург (“Антон”, “Жартаўлівы Пісарэвіч”, “Чырвоныя ружы”).

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і прачытаць з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры артыкулы (крытычныя); прачытаць апавяданні: “Рунь”, “У лазні”, “Роднае карэнне”, “Што яно?”; “Літоўскі хутарок”, “Рускі”, “Генерал”, “На этапе” і інш. – можна іншыя), аповесць-драму “Антон”, п’есы “Жартаўлівы Пісарэвіч”, “Чырвоныя ружы” (адно на выбар).

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Васючэнка, П. В. Зачараванасць патаёмным. Максім Гарэцкі і сімвалізм / Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. В. Васючэнка – Мінск : Галіяфы, 2009. – С. 38–48.

2 Максімовіч, В. Праблема “дзвюх душ” у ранніх апавяданнях М. Гарэцкага / В. Максімовіч // Роднае слова. – 2000. – № 5.

3 Мушынскі, М. Максім Гарэцкі. Перыяды творчасці / М. Мушынскі // Полымя. – 1998. – № 5.

4 Шышко, А. В. Альтэрнатыўны шлях стварэння нацыянальнага характару ў п’есе Максіма Гарэцкага «Жартаўлівы Пісарэвіч» / А. В. Шышко // Веснік БДУ. Сер. 4. – 2008. – № 1. – С. 3–6.

5 Гарэцкі, М. Творы [Электронны рэсурс] / М. Гарэцкі // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Maksim_Harecki/. – Дата доступа: 10.11.2023.

### *Індывідуальныя заданні*

1 Даць пісьмовую характарыстыку вобраза Антона з аднайменнай драматычнай аповесці.

2 Даць пісьмовую характарыстыку вобраза Пісарэвіча з драматычнага абразка “Жартаўлівы Пісарэвіч”.

3 Даць пісьмовую характарыстыку абагульненага героя ранніх апавяданняў М. Гарэцкага.

4 Патлумачце назву апавядання “Роднае карэнне”.

5 Дакажыце ці аспрэчце выказванне: М. Гарэцкі ў творах пра Першую сусветную вайну “выпрацоўваў плённую традыцыю нацыянальнай мастацкай прозы – непрымання вайны як вялікай усенароднай трагедыі”.

6 Прааналізуйце адно з прапанаваных апавяданняў (“Літоўскі хутарок”, “Рускі”).

## Практычныя заняткі 15
## Тэма: *Максім Гарэцкі*

1 Дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістычнай вайне”: гісторыя напісання, аўтабіяграфізм твора.

2 Аповесць “Ціхая плынь”: стылёвыя асаблівасці твора.

3 Творчая гісторыя і жанрава-стылёвыя асаблівасці рамана “Віленскія камунары”.

4 “Камароўская хроніка” як эпапея.

***Заданне***: пазнаёміцца са зместам лекцыі і прачытаць з ніжэй прыведзенага спісу літаратуры тры артыкулы (крытычныя); аповесці: “На імперыялістычнай вайне”, “Меланхолія”, “У чым яго крыўда?”, “Ціхая плынь”, “Дзве душы”; раман “Віленскія камунары”, эпапею “Камароўская хроніка”.

### Дадатковая літаратура да практычных

1 Адамовіч, А. “Браму скарбаў сваіх адчыняю” / А. Адамовіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1980. – 224 с.

2 Тычына, М. На выспе Патмас. Творчасць М. Гарэцкага / М. Тычына // Роднае слова. – 1993. – № 2.

3 Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым / І. П. Чыгрын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 168 с.

4 Гарэцкі, М. Творы [Электронны рэсурс] / М. Гарэцкі // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступа: http://knihi.com/Maksim_Harecki/. – Дата доступа: 10.11.2023.

### *Індывідуальныя заданні*

1 Чаму аповесць “На імперыялістычнай вайне” вызначаюць як дакументальна-мастацкія запіскі?

2 Што аб’ядноўвае аповесці “На імперыялістычнай вайне”, “Меланхолія”, “У чым яго крыўда?”? Давядзіце на прыкладах.

3 Як склаўся лёс Хомкі з аповесці “Ціхая плынь”? У чым выявіўся лірызм твора?

4 Ахарактарызуйце вобраз Мацея Мышкі з рамана “Віленскія камунары”.

5 Дайце агульную характарыстыку рамана-эпапеі “Камароўская хроніка”. Што хацеў данесці чытачам М. Гарэцкі гэтым творам?

## Увага!!!

На **9–10** балаў – патрэбна ведаць змест твораў і прачытаць, акрамя лекцыі і падручніка, тры крытычныя артыкулы розных даследчыкаў па творчасці кожнага з вывучаемых аўтараў.

На **7–8** балаў – неабходна добра арыентавацца ў змесце твораў, умець іх аналізаваць, грунтуючыся на змесце лекцыі і падручніка, пазнаёміцца з 1 крытычным артыкулам па творчасці пісьменніка.

На **5–6** балаў – ведаць змест твораў вывучаемага пісьменніка, пазнаёміцца з тэкстам лекцыі.

На **4** балы – мець уяўленне пра аўтара і яго творчасць, ведаць змест паасобных твораў.

## Увага!!!

Індывідуальныя заданні выконваюцца **пісьмова**. На іх выкананне адводзіцца **15–20 мінут**.

# ТЭСТЫ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

## Тэма: *“Нашаніўскі” перыяд. Агульная характарыстыка*

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра беларускую літаратуру пачатку XX ст. | 1) стварэнне нацыянальнага беларускага друку, які забяспечыў выданне твораў мастацкай літаратуры і стымуляваў яе развіццё, было вялікай заваёвай нацыянальнага адраджэння. Асаблівая роля ў ім належала першым беларускім газетам “Нашай долі” і “Нашай ніве”;<br>2) значэнне “Нашай нівы” і яе асаблівая заслуга ў тым, што яна была цэнтрам літаратурнага жыцця, аб’ядноўвала вакол сябе на працягу дзевяці гадоў літаратурныя сілы Беларусі;<br>3) вядучае месца ў беларускай літаратуры пачатку XX ст. займала драматургія;<br>4) у пачатку XX ст. адбывалася паскоранае развіццё беларускай літаратуры. За кароткі перыяд былі засвоены самыя важныя, самыя істотныя тыпы, віды, формы, стылі мастацкай творчасці, уласцівыя развітым літаратурам свету. |
| 2 | Пра якую газету выказаўся М. Багдановіч у прыведзенай ніжэй цытаце: “*Для многіх людзей яна з’явілася першай газетай, прачытанай імі, першай крыніцай ведаў, якая не мела афіцыяльнага адбітку і была выкладзена простай і яснай мовай. Да беларускага селяніна, які зжыўся з думкай, што ён – хам,* | 1) “Наша доля”;<br>2) “Наша ніва”;<br>3) “Гоман”;<br>4) “Беларускі шлях”. |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 3 | *а яго мова – хамская, [газета] друкаваным чынам звярнулася на гэтай "мове", выклікаючы ў ім тым самым павагу да яе і да самога сябе, абуджаючы ў ім пачуццё ўласнай годнасці*"? | |
| 3 | Газета "Наша ніва" выдавалася на Беларусі | 1) з 1902 па 1905 г.;<br>2) з верасня 1906 г. да студзеня 1907 г.;<br>3) з лістапада 1906 г. да пачатку жніўня 1915 г.;<br>4) з 1905 па 1917 г. |
| 4 | Газета "Наша доля" выдавалася на Беларусі | 1) з 1902 па 1905 г.;<br>2) з лістапада 1906 г. да пачатку жніўня 1915 г.;<br>3) з 1905 па 1917 г.;<br>4) з верасня па снежань 1906 г. |
| 5 | У газеце "Наша доля" дэбютаваў | 1) Ядвігін Ш.;<br>2) Цётка;<br>3) Я. Купала;<br>4) Я. Колас. |
| 6 | Хто з названых пісьменнікаў *не* дэбютаваў у "Нашай ніве"? | 1) М. Багдановіч;<br>2) Я. Колас;<br>3) А. Гарун;<br>4) М. Гарэцкі. |
| 7 | Дыскусію 1913 г. на старонках "Нашай нівы" распачаў | 1) Я. Купала;<br>2) Л. Гмырак;<br>3) В. Ластоўскі;<br>4) М. Гарэцкі. |
| 8 | Чым была справакавана дыскусія 1913 г. на старонках "Нашай нівы"? | 1) творчасцю Я. Купалы;<br>2) творчасцю Я. Коласа;<br>3) творчасцю М. Гарэцкага;<br>4) творчасцю М. Багдановіча. |
| 9 | Чаму была прысвечана дыскусія 1913 г. на старонках "Нашай нівы"? | 1) абмеркаванню кірунку далейшага развіцця газеты;<br>2) абмеркаванню шляхоў развіцця беларускай літаратуры;<br>3) абмеркаванню тэматыкі будучых публіцыстычных твораў;<br>4) абмеркаванню творчасці самых актыўных аўтараў газеты. |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 10 | У чым значэнне газеты “Наша ніва”? | 1) узрасціла цэлае суквецце талентаў;<br>2) на яе старонках адбываўся працэс далейшага ўнармавання беларускай літаратурнай мовы і правапісу;<br>3) стварыла такую літаратуру, якая годна ўпісалася ў агульна-еўрапейскі культурны кантэкст;<br>4) усе адказы правільныя. |

## Тэма: ***Ядвігін Ш.***

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся Ядвігін Ш.? | 1) у засценку Акінчыцы на Міншчыне, у 1882 г.;<br>2) у г. Мінску, у 1891 г.;<br>3) у вёсцы Нізок на Міншчыне, у 1893 г.;<br>4) у маёнтку Добасня, на Рагачоўшчыне, у 1868 г. |
| 2 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць Ядвігіна Ш. | 1) першае апавяданне на беларускай мове “Суд” было надрукавана ў “Нашай долі”;<br>2) пяру Ядвігіна Ш. належыць вершаванае апавяданне “Дзед Завала”;<br>3) выдаў зборнік паэзіі “Хрэст на свабоду”;<br>4) працаваў тэхнічным рэдактарам беларускага сельскагаспадарчага часопіса “Саха”. |
| 3 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць Ядвігіна Ш. | 1) пэўны час наведваў прыватную школу ў фальварку Люцынка, заснаваную дачкой В. Дуніна-Марцінкевіча;<br>2) вучыўся на медыцынскім факультэце Маскоўскага ўніверсітэта; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 4 | | 3) за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў зняволены ў маскоўскай Бутырцы;<br>4) з’яўляецца аўтарам паэтычнага зборніка “Песні жальбы”. |
| 4 | Як называецца твор Ядвігіна Ш., цытата з якога прыведзена ніжэй: “*Гэта ж твой боль, гэта ж твой жаль спарахнілі гэту бярозку, бо ты доляй сваёй жалілася ёй. Дрэва і то спужалася такой долі...*” | 1) апавяданне “Зарабляюць;<br>2) апавяданне “Бярозка”;<br>3) апавяданне “Раны”;<br>4) апавяданне “Гаротная”. |
| 5 | Аўтарам якога з пералічаных зборнікаў з’яўляецца Ядвігін Ш.? | 1) “Васількі”;<br>2) “Абразкі”;<br>3) “Песні”;<br>4) “Казкі жыцця”. |
| 6 | Вызначце твор Ядвігіна Ш. па наступнай інфармацыі: “*Тэма “ўлада грошай” не новая ў сусветным мастацтве. Але Ядвігін Ш. раскрывае яе на новым жыццёвым матэрыяле, падае характары ў спецыфічных нацыянальных абставінах. У аповесці апісаны побыт, норавы, патрэбы, спадзяванні беларускага селяніна, ярка намаляваны асноўныя рысы сялянскай псіхалогіі, узаемаадносіны мужыка з местачковым мяшчанствам*”. | 1) “Зарабляюць”;<br>2) “Золата”;<br>3) “Гаротная”;<br>4) “Гадунец”. |
| 7 | Вызначце твор Ядвігіна Ш. па наступнай цытаце: “*Але як гром з яснага неба, неспадзяванае няшчасце знішчожыла ўжо надзею абяднеўшага народа: яго стогн каціўся па зямлі, але не шыбаў у гару, дзе бы пачуў народны выбранец, а той, спаглядаючы з гэтай вышы* | 1) “Заведзеная надзея”;<br>2) “Падласенькі”;<br>3) “Бярозка”;<br>4) “Васількі”. |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | *ўніз, не мог дагледзець потам і крывёй злітай зямлі, па каторай варушыліся яго маленькія кармільцы*". | |
| 8 | Героямі якога твора Ядвігіна Ш. з'яўляюцца Васіль Дубінскі і Зося Стрончык? | 1) "Раны";<br>2) "Дуб-дзядуля";<br>3) "Золата";<br>4) "Васількі". |
| 9 | Як склаўся лёс Зосі Стрончык з рамана Ядвігіна Ш. "Золата"? | 1) пераязджае на сталае жыхарства ў Амерыку да Алёксы і сына;<br>2) гадуе дачку Прузыну і памірае сваёй смерцю ў глыбокай старасці;<br>3) лёс яе дакладна невядомы, бо аўтар не закончыў твор;<br>4) выходзіць замуж другі раз. |
| 10 | Якія з ніжэйпералічаных твораў не належыць пяру Ядвігіна Ш.? | 1) "Зарабляюць";<br>2) "З маленькім білецікам";<br>3) "Міхаська";<br>4) "Важная фіга". |

## Тэма: ***Цётка***

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Знайдзіце няправільны варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць Цёткі. | 1) вучылася ў прыватнай жаночай гімназіі В. Прозаравай у Вільні;<br>2) выязджала ў эміграцыю ў Аўстра-Венгрыю;<br>3) з'яўляецца аўтарам апавядання "Зялёнка";<br>4) памерла ад сухотаў. |
| 2 | Самымі раннімі паэтычнымі творамі Цёткі лічацца вершы: | 1) "Мора" і "Хрэст на свабоду";<br>2) "Лета" і "Восень";<br>3) "Нямаш, але будзе","Мужык не змяніўся";<br>4) "Скрыпка", "Музыкант беларускі". |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 3 | Першымі друкаванымі вершамі Цёткі лічацца: | 1) “Мора” і “Хрэст на свабоду”;<br>2) “Лета” і “Восень”;<br>3) “Мужык не змяніўся”, “Нямаш, але будзе”;<br>4) “Артыст грайка”, “Музыкант беларускі”. |
| 4 | Пачаткам *празаічнай* творчасці Цёткі стала апавяданне | 1) “Міхаська”;<br>2) “Прысяга над крывавымі разорамі”;<br>3) “Сірата”;<br>4) “Асеннія лісты”. |
| 5 | Апавяданне Цёткі “Прысяга над крывавымі разорамі” ўпершыню было надрукавана ў | 1) газеце “Наша ніва”;<br>2) альманаху “Велікодная пісанка”;<br>3) газеце “Наша доля”;<br>4) альманаху “Калядная пісанка”. |
| 6 | Як называлася перыядычнае выданне для моладзі, што выдавала Цётка ў 1914 г. у Мінску? | 1) газета “Наша ніва”;<br>2) часопіс “Саха”;<br>3) часопіс “Лучынка”;<br>4) газета “Наша доля”. |
| 7 | Персанаж якога твора якога аўтара сніць сон, у якім бачыць поўныя крыві разоры і над імі тры скрыжаваныя далоні? | 1) “Сон на кургане” Я. Купалы;<br>2) “Прысяга над крывавымі разорамі” Цёткі;<br>3) “Лабірынты” В. Ластоўскага;<br>4) “Дуб-дзядуля” Ядвігіна Ш. |
| 8 | Гэты верш Цёткі – самы яркі з яе рэвалюцыйных твораў. У ім падзеі рэвалюцыі паказаны на самым уздыме, у кульмінацыі. Каб перадаць высокае напружанне барацьбы супраць самаўладства, аўтарка звяртаецца да рамантычных прыёмаў, выкарыстоўвае сімволіку. Укажыце назву верша. | 1) “Суседзям у няволі”;<br>2) “Мора”;<br>3) “Мужык не змяніўся”;<br>4) “Артыст грайка”. |
| 9 | Вызначце твор Цёткі па наступнай цытаце: “*Сядзелі на прызбе, кланілі к сабе галовы, як дзве высахшыя макаўкі* | 1) “Зялёнка”;<br>2) “Лішняя”;<br>3) “Асеннія лісты”;<br>4) “Міхаська”. |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | *пад сільным ветрам, і вялі гарачую гутарку. – Дзякуй, Сымонка, дзякуй, што адведаў ты мяне хаця перад смерцю. Рад, вельмі рад, – скрыпеў сухім голасам Сцяпан. – Гляджу на цябе і не веру сваім вачам – ці гэта ты, ці не ты? – Мо і не я, – смяяўся Сымон, – пастукай! Толькі паволі, бо я цяпер шкляны, гыгы! – Смех смехам, а кусок часу. То ж мы з табой і не бачыліся з тае пары, як я купіў у Меера рабую карову і як прытрапілася, помніш?.. тое...”.* | |
| 10 | Вызначце твор Цёткі па наступнай цытаце: “*Выпечаны румянец на твары, кашаль сухі і схварэлае цела адразу людзям кажуць пра маю цяжкую хваробу. Пасажыры ахвотна ўступаюць месца. У вачах іх я бачу, што шкадуюць маёй маладосці. Закрываю векі. Не хачу відзець іх жаласці, бо веру, што ашукаю ваш жаль, людзі добрыя, што змагу цябе, смерць лютая, а цвёрдае жыццё вазьму ў свае рукі...*” | 1) “Успаміны з паездкі ў Фінляндыю”;<br>2) “Лішняя”;<br>3) “Асеннія лісты”;<br>4) “З дарогі”. |

## Тэма: *Вацлаў Ластоўскі*

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся В. Ластоўскі? | 1) засценак Калеснікі на Дзісненшчыне, у 1883 г.;<br>2) вёска Нізок на Міншчыне, у 1893 г.; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
| --- | --- | --- |
| | | 3) вёска Пасадзец на Лагойшчыне, у 1886 г.;<br>4) вёска Пешчына недалёка ад Ліды, у 1876 г. |
| 2 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра *жыццё* В. Ластоўскага. | 1) Вацлаў Ластоўскі быў вядомы на пачатку XX ст. больш пад псеўданімам *Власт*;<br>2) скончыў народную, Старапагосцкую, школу (1898–1902 гг.), ды на працягу года наведваў лекцыі ў Пецярбургскім універсітэце;<br>3) памёр ад сухотаў.<br>4) адным з псеўданімаў В. Ластоўскага з’яўляецца Ю. Верашчака. |
| 3 | У якім апавяданні В. Ластоўскага закранаецца праблема п’янства? | 1) “Лебядзіная песня”;<br>2) “Панас гуляе”;<br>3) “Мост у Кутах”;<br>4) “Разбойнік”. |
| 4 | Героем якога апавядання В. Ластоўскага з’яўляецца Грыгор Лежня? | 1) “Лебядзіная песня”;<br>2) “Панас гуляе”;<br>3) “Мост у Кутах”;<br>4) “Сож і Няпро”. |
| 5 | Радкі з якога твора В. Ластоўскага прыведзены ніжэй?<br>*“– Што гэта вы, людзі добрыя, робіце?*<br>*– А хіба не бачыце? Сонца ў хаты носім!*<br>*– Слухай, <...>! Гэта ж надта добрая рэч – мець сонца ў хаце! Пойдзем паглядзімо, ці многа ўжо нанасілі гэтыя людзі сонца і ў якім месцы яны прычапілі яго, каб свяціла?”* | 1) “Лабірынты”;<br>2) “Апаўшае лісце”;<br>3) “Прыгоды Панаса і Тараса”;<br>4) “Слёзы”. |
| 6 | Гэты твор В. Ластоўскага – “мастацка-філасофскае ўвасабленне ідэі беларускага | 1) апавяданне “Лебядзіная песня”;<br>2) аповесць “Лабірынты”; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | нацыянальнага быцця”, “стварэнне нацыянальнага міфа аб беларусах”, “мара-згадка пра “залатыя часіны” беларусаў”. Вызначце гэты твор. | 3) легенда “Вітаўт і Ягайла”;<br>4) імпрэсія “Мары”. |
| 7 | Калі і дзе адбываецца дзеянне ў аповесці В. Ластоўскага “Лабірынты?” | 1) у пачатку XX ст. у Вільні;<br>2) у пачатку XIX ст. у Вільні;<br>3) у пачатку XX ст. у Полацку;<br>4) у пачатку XIX ст. у Полацку. |
| 8 | Радкі з якога твора В. Ластоўскага прыведзены ніжэй?<br>*“Пад уплывам гэтага святла вапна не можа ў арганізме зацвердзяваць, а дзеля гэтага чалавек застаецца назаўсёды ў адным веку, а як вынік гэтага – не падлягае смерці”.* | 1) “Прыгоды Панаса і Тараса”;<br>2) “Каменная труна”;<br>3) “Лабірынты”;<br>4) “Бяздоннае багацце”. |
| 9 | Няправільна вызначаць жанр “Лабірынтаў” В. Ластоўскага, як | 1) прыгодніцка-гістарычны;<br>2) утопія;<br>3) любоўны раман;<br>4) інтэлектуальны дэтэктыў. |
| 10 | Да рэалістычнага кірунку *не адносіцца* такое апавяданне В. Ластоўскага, як | 1) “Лебядзіная песня”;<br>2) “Мост у Кутах”;<br>3) “Дзень ружавай кветкі”;<br>4) “Панас гуляе”. |

## Тэма: *Змітрок Бядуля*

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся З. Бядуля? | 1) г. Мінск, у 1891 г.;<br>2) вёска Нізок на Міншчыне, у 1893 г.;<br>3) г. Мінск, у 1887 г.;<br>4) вёска Пасадзец на Лагойшчыне, у 1886 г. |
| 2 | Назавіце сапраўднае імя і прозвішча Змітрака Бядулі | 1) Кандрат Кандратавіч Атраховіч;<br>2) Самуіл Яфімавіч Плаўнік; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | | 3) Іван Дамінікавіч Луцэвіч;<br>4) Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. |
| 3 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць З. Бядулі. | 1) вучыўся спачатку ў хедары (мястэчка Даўгінава), а пасля ў ешыбоце (школа рабінаў) у Іллі;<br>2) працаваў у газеце “Наша ніва” з сярэдзіны 1913 г. да сярэдзіны 1915 г.;<br>3) уваходзіў у літаратурнае аб’яднанне “Маладняк”, пасля – ва “Узвышша”;<br>4) быў арыштаваны па справе “Саюза вызвалення Беларусі” і асуджаны да пяцігадовай высылкі ў Вятку. |
| 4 | Якім псеўданімам З. Бядуля падпісваў вершы ў нашаніўскі перыяд? | 1) Сальвэсь;<br>2) І. Абдзіраловіч;<br>3) І. Жывіца;<br>4) Ясакар. |
| 5 | Радкі з якога верша З. Бядулі прыведзены ніжэй:<br>*То не снег – то чаромха цвіце:*<br>*Падарунак вясны-дабрадзейкі,*<br>*То не снег – то бярозка расце,*<br>*То не снег – матылёчкаў сямейка.* | 1) “Вайна”;<br>2) “Юда жэніцца”;<br>3) “Вясной”;<br>4) “Сняжынкі”. |
| 6 | У якім апавяданні З. Бядулі героі (Магдуля і Сідаронак) – жабракі? | 1) “Пяць лыжак заціркі”;<br>2) “На каляды к сыну”;<br>3) “Ашчаслівіла”;<br>4) “Велікодныя яйкі”. |
| 7 | Героямі якога апавядання З. Бядулі з’яўляюцца Тэкля, Цыпрук і Лаўручок? | 1) “Пяць лыжак заціркі”;<br>2) “Малыя дрывасекі”;<br>3) “На каляды к сыну”;<br>4) “Вялікодныя яйкі”. |
| 8 | Радкі з якога апавядання З. Бядулі прыведзены ніжэй:<br>*Стары Даніла славіўся на цэлую ваколіцу сваімі* | 1) “Пяць лыжак заціркі”;<br>2) “Бондар”;<br>3) “На каляды к сыну”;<br>4) “Ашчаслівіла”. |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | *вырабамі: вёдрамі, начоўкамі, цабэркамі і лыжкамі, якія выходзілі з яго рук моцныя, гладкія і вельмі зграбныя. Ён іх прадаваў на ўсіх кірмашах. У яго іх ахвотна куплялі ўсюды, і ён жыў з жонкай прыпяваючы. Дзяцей у іх не было, гарэлкі ён не піў, так што «залатыя рукі», як казалі аб ім суседзі, кармілі яго даволі шчодра. А «залатыя рукі» не настолькі цікавілі іх гаспадара Данілу тымі залатоўкамі і рублямі, што яны яму давалі, як здатнасцю і кемнасцю. Мэтай яго жыцця былі не заработкі, а праца сама па сабе, той любімы час працы, які дае праўдзівае шчасце майстру.* | |
| 9 | У якім годзе і дзе быў *надрукаваны* зборнік З. Бядулі “Абразкі”? | 1) у 1910 г. у Вільні;<br>2) у 1913 г. у Пецярбургу;<br>3) у 1914 г. у Вільні;<br>4) у 1918 г. у Мінску. |
| 10 | Таленавітасць вясковага хлопчыка і яго прага да мастацтва насуперак жыццёвым цяжкасцям адлюстраваны ў апавяданні З. Бядулі | 1) “Велікодныя яйкі”;<br>2) “На каляды к сыну”;<br>3) “Пяць лыжак заціркі”;<br>4) “Малыя дрывасекі”. |

## **Тэма**: ***Алесь Гарун***

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся А. Гарун? | 1) у фальварку Вязынка на Міншчыне, у 1882 г.;<br>2) г. Мінск, у 1887 г.<br>3) вёска Нізок на Міншчыне, у 1893 г.;<br>4) вёска Пасадзец на Лагойшчыне, у 1886 г. |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 2 | Назавіце сапраўднае імя і прозвішча Алеся Гаруна | 1) Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч;<br>2) Іван Дамінікавіч Луцэвіч;<br>3) Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі;<br>4) Зміцер Хведаравіч Жылуновіч. |
| 3 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць А. Гаруна. | 1) у 1902 г. скончыў Мінскае рамесніцкае вучылішча, потым працаваў сталяром;<br>2) быў арыштаваны ў падпольнай друкарні і асуджаны на дзевяцігадовую ссылку ў Сібір;<br>3) з'яўляецца аўтарам паэтычнага зборніка "Шляхам жыцця";<br>4) паэт хварэў на сухоты. Памёр у ліпені 1920 г., не даехаўшы да прыкарпацкага курорта Закапанэ, куды сябры адправілі яго лячыцца. |
| 4 | Аўтарам якога паэтычнага зборніка з'яўляецца А. Гарун? | 1) "Вянок";<br>2) "Песні жальбы";<br>3) "Матчын дар";<br>4) "Жалейка". |
| 5 | Які з псеўданімаў *не належыць* А. Гаруну? | 1) А. Сумны;<br>2) І. Жывіца;<br>3) І. Крыніца;<br>4) Новадворскі. |
| 6 | Пра які скарб ідзе гаворка ў наступных радках верша А. Гаруна:<br>*Ад дзядоў і ад прадзедаў, браце,*<br>*Гэты скарб нам адзін захаваўся,*<br>*У сялянскай аграбленай хаце*<br>*Толькі ён не забраны астаўся.* | 1) праўда;<br>2) доля;<br>3) мова;<br>4) воля. |
| 7 | Радкі з якога апавядання А. Гаруна прыведзены ніжэй: | 1) "П'ера і Каламбіна";<br>2) "Свята"; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
|  | *“Доўга аб тым, куды зайсці, Грыневіч не разважаў. У кішэні яго ляжала пятнаццаць рублёў, а з грашмі, як ён ужо пераканаўся, ува ўсякую хату прымуць. Якраз другім з краю стаяў нечы нанова пабудаваны двор з высокімі, сібірскага кшталту, на дзве весніцы варотамі і шырокаю форткаю. У гэты двор Грыневіч і зайшоў”* | 3) “Пан Шабуневіч”;<br>4) “Чалавек без крыві”. |
| 8 | Вызначце твор А. Гаруна па наступнай інфармацыі: “*Гэты твор – спроба асэнсаваць феномен нераздзеленага кахання на прыкладзе розных узроставых катэгорый герояў, прасачыць магчымыя варыянты паводзінаў герояў. Гэта не прыгожая “казка пра каханне”, пра зараджэнне гэтага пачуцця, гэта глыбокі псіхалагічны аналіз яго магчымых наступстваў, выяўленне стэрэатыпаў мужчынскасці*”. | 1) п’еса “Хлопчык у лесе”;<br>2) апавяданне “П’ера і Каламбіна”;<br>3) п’еса “Шчаслівы чырвонец”;<br>4) апавяданне “Чалавек без крыві”. |
| 9 | Вызначце драматургічны твор А. Гаруна па наступнай інфармацыі: “*Герой у сне трапіў у царства магутнага чараўніка і выратаваў запалоненых ім дзяўчат. Гаспадарамі лесу былі добрыя духі, увасобленыя ў вобразах кветак, менавіта яны паспрыялі, каб Хлопчык трапіў у казачную краіну, дабыў там чароўную жалейку, пры дапамозе якой ён выгнаў гаспадара зачараванага чарства*”. | 1) “Датрымаў характар”;<br>2) “Хлопчык у лесе”;<br>3) “Шчаслівы чырвонец”;<br>4) “Дзіўны лапаць...” |
| 10 | Вызначце твор А. Гаруна па наступнай інфармацыі: “*Твор нетрадыцыйны паказам вобра-* | 1) п’еса “Хлопчык у лесе”;<br>2) апавяданне “П’ера і Каламбіна”; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | *за жабракоў. Старая і хворая Жабрачка не просіць міласціну ў людзей. Яе мэта – дапамагаць людзям*". | 3) п'еса "Шчаслівы чырвонец";<br>4) апавяданне "Чалавек без крыві". |

## Тэма: ***Цішка Гартны***

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Вызначце сапраўднае імя Цішкі Гартнага. | 1) Канстанцін Міцкевіч;<br>2) Самуіл Плаўнік;<br>3) Аляксандр Прушынскі;<br>4) Зміцер Жылуновіч. |
| 2 | З якой сям'і паходзіў Ц. Гартны? | 1) гарбароў;<br>2) местачковых дзедзічаў;<br>3) бедных сялян-чорнарабочых;<br>4) беззямельнай шляхты. |
| 3 | У якасці каго пачаў сваю "дарослую" працоўную дзейнасць будучы пісьменнік? | 1) настаўніка;<br>2) выдаўца;<br>3) хатняга "дырэктара";<br>4) рабочага. |
| 4 | Першыя беларускамоўныя творы Ц. Гартнага былі надрукаваны: | 1) у "Нашай долі";<br>2) у "Нашай ніве";<br>3) у "Дзянніцы";<br>4) у "Вольнай Беларусі". |
| 5 | Вызначце апавяданне Ц. Гартнага па наступнай інфармацыі: "*Маладая жанчына Аўдоцця – маці траіх дзяцей. Пакінутая мужам, яна без сродкаў для існавання вымушана прадаваць сябе*". | 1) "Свае блінцы";<br>2) "Распусніца";<br>3) "Спатканне";<br>4) "Лайдак". |
| 6 | Якую пасаду заняў Ц. Гартны адразу пасля абвяшчэння Беларусі савецкай рэспублікай? | 1) дырэктар Дзяржвыдавецтва Беларусі;<br>2) Старшыня Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага урада;<br>3) намеснік міністра асветы БССР;<br>4) рэдактар газеты "Савецкая Беларусь". |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 7 | Каго з герояў рамана “Сокі цаліны” характарызуюць наступныя радкі з тэкста: *“...малады і моцны, але нехлюяваты, сутулы і касы, з лёгкім рабаціннем на белым пляскатым твары”?* | 1) Рыгора;<br>2) Васіля;<br>3) Сёмку;<br>4) Петруся. |
| 8 | Мястэчка, ў якім адбываецца дзеянне першай квадры рамана Ц. Гартнага “Сокі цаліны” называецца | 1) Глінішчы;<br>2) Куранi;<br>3) Цельшына;<br>4) Сілцы. |
| 9 | Першая квадра рамана “Сокі цаліны” заканчваецца: | 1) сватаннем Зосі;<br>2) вяселлем Зосі;<br>3) забастоўкай гарбароў;<br>4) ад’ездам Рыгора ў Рыгу. |
| 10 | Вызначце *няправільны* варыянт інфармацыі пра Ц. Гартнага: | 1) у гісторыю беларускай літаратуры Ц. Гартны ўвайшоў, як пісьменнік, што раскрыў псіхалогію рабочага чалавека;<br>2) у гісторыю беларускай літаратуры Ц. Гартны ўвайшоў, як аўтар першага закончанага рамана;<br>3) у гісторыю беларускай літаратуры Ц. Гартны ўвайшоў, як адкрывальнік тэмы сацыяльнай нядолі селяніна;<br>4) у гісторыю беларускай літаратуры Ц. Гартны ўвайшоў, як “пясняр працы і змагання”. |

## Тэма: *Янка Купала*

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся Я. Купала? | 1) у г. Мінску, у 1891 г.;<br>2) у вёсцы Нізок на Міншчыне, у 1893 г.;<br>3) у г. Мінску, у 1887 г.;<br>4) у фальварку Вязынка на Міншчыне, у 1882 г. |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 2 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць Я. Купалы. | 1) бацькі – Дамінік Ануфрыевіч і Бянігна Іванаўна – паходзілі з дробнай чыншавай шляхты;<br>2) у 16-гадовым узросце скончыў поўны курс (два класы за адзін год) Бяларуцкага народнага вучылішча;<br>3) па запрашэнні прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы пераязджае з Вільні ў Пецярбург, дзе жыве звыш трох гадоў, наведвае заняткі вячэрніх агульнаадукацыйных курсаў А. Чарняева;<br>4) падчас Першай сусветнай вайны ваяваў сувязістам у артылерыйскай батарэі, быў паранены ў нагу, доўга лячыўся ў розных шпіталях. |
| 3 | Які верш Я. Купалы набыў статус нацыянальнага гімна? | 1) “Мая доля”;<br>2) “А хто там ідзе?”;<br>3) “Спадчына”;<br>4) “Ворагам беларушчыны”. |
| 4 | Героямі якой паэмы Я. Купалы з’яўляюцца Гусляр і Князь? | 1) “ Курган”;<br>2) “Магіла льва”;<br>3) “Яна і я”;<br>4) “На Дзяды”. |
| 5 | Героямі якой паэмы Я. Купалы з’яўляюцца Машэка і Наталька? | 1) “Курган”;<br>2) “Магіла льва”;<br>3) “Яна і я”;<br>4) “На Дзяды” |
| 6 | Які твор Я. Купалы даследчыкі вызначаюць як містэрыю? | 1) “Магіла льва”;<br>2) “Сон на кургане”;<br>3) “Адвечная песня”;<br>4) “Раскіданае гняздо”. |
| 7 | Герой гэтага твора Я. Купалы бачыць у сне сваю будучыню. Вызначце твор і героя. | 1) “Курган” Гусляр;<br>2) “Сон на кургане”, Сам;<br>3) “Адвечная песня”, Мужык;<br>4) “Раскіданае гняздо”, Сымон. |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
| --- | --- | --- |
| 8 | Каму з герояў драмы Я. Купалы “Раскіданае гняздо” належаць словы, прыведзены ніжэй: *“Чалавек з зямлёй зрастаецца, як гэта дрэва: ссячы дрэўца – засохне, адбяры ў чалавека зямлю – згіне”* | 1) Лявону;<br>2) Марылі;<br>3) Сымону;<br>4) Старцу. |
| 9 | У гэтым творы Я. Купалы знайшлі мастацкае ўвасабленне вызваленчыя ідэі беларускага народа, яго імкненне да свабоды, да сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення. У ім адлюстраваны тыповыя для Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. грамадскія працэсы. Гісторыя адной сялянскай сям’і ўзнята ў п’есе да сімвала трагічнага лёсу ўсяго беларускага сялянства. Вызначце назву твора. | 1) “Раскіданае гняздо”;<br>2) “Паўлінка”;<br>3) “Тутэйшыя”;<br>4) “Адвечная песня”. |
| 10 | Каму з герояў трагікамедыі Я. Купалы “Тутэйшыя” належаць словы, прыведзены ніжэй: “*можна мець светапогляд адзін, думаць другое, гаварыць трэцяе, а рабіць чацвёртае*”? | 1) Янку Здольніку;<br>2) Спічыні;<br>3) Мікіту Зносаку;<br>4) Лявону Гарошку. |

## Тэма: *Якуб Колас*

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
| --- | --- | --- |
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся Я. Колас? | 1) у Мінску, у 1891 г.;<br>2) у засценку Акінчыцы на Міншчыне, у 1882 г.;<br>3) у Мінску, у 1887 г.;<br>4) у вёсцы Пасадзец на Лагойшчыне, у 1886 г. |
| 2 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць Я. Коласа. | 1) закончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю;<br>2) дэбютаваў як паэт у 1905 г. у газеце “Северо-Западный край” вершам “Мужык”; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | | 3) быў асуджаны на тры гады турэмнага зняволення, тэрмін пакарання адбыў у Мінскім астрозе;<br>4) першы паэтычны зборнік меў назву “Песні жальбы” і выйшаў з друку ў 1910 г. |
| 3 | Першы паэтычны зборнік Якуба Коласа меў назву | 1) “Жалейка”;<br>2) “Вянок”;<br>3) “Песні жальбы”;<br>4) “Матчын дар”. |
| 4 | Дэбют Я. Коласа адбыўся ў газеце | 1) “Северо-западный край”;<br>2) “Наша доля”;<br>3) “Наша ніва”;<br>4) “Минский листок”. |
| 5 | Вызначце твор Я. Коласа па наступным урыўку:<br>*Максім старанна аглядаў сляды нядаўняй пакражы ў яго абходзе. Высокі, упалавіну чалавека, дубовы пень ясна вылучаўся сярод дзеравяк і свяціў сваім светла-жоўтым верхам і свежымі трэскамі вакол, а шырокая разложная верхавіна і адсечаныя сукі пазіралі так нявесела, так сумна, бы тыя пакінутыя бацькам дзеці.* | 1) апавяданне “Нёманаў дар”;<br>2) апавяданне “Малады дубок”;<br>3) апавяданне “Соцкі падвёў”;<br>4) апавяданне “Тоўстае палена”. |
| 6 | Героямі якога твора Я. Коласа з’яўляюцца дзед Курыла і дзед Даніла? | 1) паэмы “Новая зямля”;<br>2) трылогіі “На ростанях”;<br>3) паэмы “Сымон-музыка”;<br>4) апавядання “Нёманаў дар”. |
| 7 | Асноўнай праблемай паэмы Я. Коласа “Новая зямля” з’яўляецца | 1) праблема нераздзеленага кахання;<br>2) праблема свабоды творчасці;<br>3) праблема зямлі і волі;<br>4) праблема сэнсу жыцця. |
| 8 | Вызначце імя і прозвішча героя, а таксама твор Я. Коласа, карыстаючыся наступнай харак- | 1) Міхал, паэма “Новая Зямля”;<br>2) Андрэй Плех, апавяданне “Малады дубок”; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | тарыстыкай: *Герой гэтага твора Я. Коласа "і ёсць той сейбіт, які выйшаў на беларускую ніву, каб сеяць у душах людзей новыя ідэі. Але перш чым сеяць, ён павінен быў разабрацца ў самім сабе, адказаць на пытанне "дзеля чаго жыве чалавек".* | 3) Андрэй Лабановіч, трылогія "На ростанях";<br>4) Васіль Падбярозны, апавяданне "Нёманаў дар". |
| 9 | Вызначце творы Я. Коласа па наступнай інфармацыі "*Не даючы якога-небудзь канкрэтнага, індывідуалізаванага вобраза, творы вырашалі праблему выяўлення нацыянальнага характару... У іх улоўлена і выяўлена само светаўспрыманне, светаадчуванне народа, яго характар, асаблівасці. У іх дзейнымі асобамі з'яўляюцца прыродныя стыхіі, праявы, рэчы, звяры, птушкі*". | 1) палескія аповесці "У палескай глушы" і "У глыбі Палесся";<br>2) зборнік "Апавяданні";<br>3) аповесць "На прасторах жыцця";<br>4) зборнік "Казкі жыцця". |
| 10 | Да "казак жыцця" Я. Коласа *не адносіцца* такі твор, як | 1) "Адзінокае дрэва";<br>2) "Балотны агонь";<br>3) "Нёманаў дар";<br>4) "Зло не заўсёды зло". |

## Тэма: ***Максім Багдановіч***

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся М. Багдановіч? | 1) г. Мінск, у 1891 г.;<br>2) вёска Нізок на Міншчыне, у 1893 г.;<br>3) г. Мінск, у 1887 г.;<br>4) вёска Пасадзец на Лагойшчыне, у 1886 г. |
| 2 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць М. Багдановіча. | 1) нарадзіўся будучы паэт у сям'і настаўніка, этнографа і фалькларыста Адама Ягоравіча; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | | 2) вучыўся ў Ніжагародскай і Яраслаўскай гімназіях;<br>3) у 1913 г. у Вільні ў друкарні Марціна Кухты выходзіць адзіны паэтычны зборнік паэта – “Вянок”;<br>4) паэт хварэў на сухоты. Памёр у ліпені 1920 г., не даехаўшы да прыкарпацкага курорта Закапанэ, куды сябры адправілі яго лячыцца. |
| 3 | Які горад М. Багдановіч апеў у сваіх вершах? | 1) Мінск;<br>2) Ніжні Ноўгарад;<br>3) Вільню;<br>4) Яраслаўль. |
| 4 | Якім творам дэбютаваў М. Багдановіч у газеце “Наша ніва”? | 1) вершам “Зорка Венера”;<br>2) апавяданнем “Музыка”;<br>3) апавяданнем “Апокрыф”;<br>4) вершам “Беларусь, твой народ дачакаецца”. |
| 5 | У якім годзе і дзе быў *надрукаваны* зборнік М. Багдановіча “Вянок”? | 1) у 1906 г. у Пецярбургу;<br>2) у 1906 г. у Жоўкве;<br>3) у 1913 г. у Вільні;<br>4) у 1913 г. у Пецярбургу. |
| 6 | Гэты верш – адзін з самых лірычных і музычных твораў М. Багдановіча. Ён напісаны ў жанры песні-раманса, пакладзены на музыку; з’яўляецца ўвасабленнем “шчасця кахання”, маладосці, красы жыцця. | 1) “Маладыя гады...”;<br>2) “Зорка Венера ўзышла над зямлёю...”;<br>3) “Маёвая песня” (“Па-над белым пухам вішняў...”);<br>4) “Слуцкія ткачыхі”. |
| 7 | Да якога жанру/віду лірыкі адносіцца верш М. Багдановіча “Санет” (“Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...”) | 1) інтымнай;<br>2) грамадзянскай;<br>3) філасофскай;<br>4) пейзажнай. |
| 8 | Вызначце твор М. Багдановіча па наступным урыўку:<br>*Хвалююць сэрца нам дзявочыя пастаці,* | 1) “Зорка Венера”;<br>2) “У вёсцы”;<br>3) “Вераніка”;<br>4) “Ізноў пабачыў я сялібы...” |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 9 | *І душы мацярэй нас могуць чараваці;*<br>*Вышэйшая краса – ў іх зліт-насьці жывой!*<br>*Артысты-маляры схіляліся прад ёй,*<br>*Жадаючы з'явіць цераз свае халсціны*<br>*Пачуцці мацеры у вобліку дзяўчыны...* | |
| 9 | Каму прысвяціў свой паэтычны зборнік "Вянок" М. Багдановіч? | 1) Цётцы;<br>2) К. Каганцу;<br>3) С. Палуяну;<br>4) Я. Купалу. |
| 10 | У якім празаічным творы М. Багдановіча намаляваны сімвалічныя вобразы музыкі і васілька? | 1) "Музыка";<br>2) "Шаман";<br>3) "Апокрыф";<br>4) "Апавяданне аб іконніку і залатару". |

## Тэма: *Максім Гарэцкі*

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| 1 | Дзе і ў якім годзе нарадзіўся Максім Гарэцкі? | 1) у Мінску, у 1891 г.;<br>2) у вёсцы Мал. Багацькаўка на Магілёўшчыне, у 1893 г.;<br>3) у вёсцы Пасадзец на Лагойшчыне, у 1886 г.;<br>4) у былым засценку Калеснікі на Дзісненшчыне, у 1883 г. |
| 2 | Знайдзіце *няправільны* варыянт інфармацыі пра жыццё і творчасць М. Гарэцкага. | 1) нарадзіўся ў небагатай яўрэйскай сям'і ў мястэчку Пасадзец на Віленшчыне; бацька быў арандатарам, гандляром, прыказчыкам; маці працавала швачкай-каптурніцай;<br>2) прыняты ў Горы-Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча на казённы кошт; |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
|---|---|---|
| | | 3) падчас Першай сусветнай вайны быў сувязістам у артылерыйскай батарэі;<br>4) дэбютаваў у 1913 г. апавяданнем "У лазні", надрукаваным у "Нашай ніве". |
| 3 | Героем ранніх апавяданняў М. Гарэцкага з'яўляецца? | 1) сувязны артылерыйскай батарэі;<br>2) інтэлігент у першым пакаленні;<br>3) селянін-праўдашукальнік;<br>4) рабочы ў першым пакаленні. |
| 4 | У апавяданнях пра Першую сусветную вайну М. Гарэцкі | 1) асуджаў вайну і тых, хто яе распачаў;<br>2) усхваляў гераізм людзей на вайне;<br>3) захапляўся роднымі краявідамі;<br>4) апяваў веліч кахання. |
| 5 | Якія з драматургічных твораў *не належыць* пяру М. Гарэцкага? | 1) "Антон";<br>2) "Жартаўлівы Пісарэвіч";<br>3) "Чырвоныя ружы";<br>4) "Тутэйшыя". |
| 6 | Чым, на думку беларускага аўтара, героя драматычнай аповесці "Антон", абумоўлена трагедыя галоўнага героя твора Антона Жабона? | 1) духоўнымі пошукамі героя;<br>2) п'янствам бацькі;<br>3) агульнай неадукаванасцю;<br>4) здрадай жонкі. |
| 7 | Які з названых твораў М. Гарэцкага застаўся незакончаным? | 1) "Ціхая плынь";<br>2) "На імперыялістычнай вайне";<br>3) "Камароўская хроніка";<br>4) "Віленскія камунары". |
| 8 | Вызначце твор М. Гарэцкага па наступным урыўку: "*На выгляд гэта ёсць даволі здаровы мужчына. Ён сярэдняга росту, добрага складу, шыракаплечы, і грудзі ў яго звычайныя. На твары ніякай хваравітасці не відаць, – пэўна ж, калі ўва-* | 1) "Літоўскі хутарок";<br>2) "Генерал";<br>3) "Рускі";<br>4) "Маці". |

| № | Тэставыя пытанні | Варыянты адказаў |
| --- | --- | --- |
| 9 | *жаць на тое, што чалавек прыехаў не з гасцей, а з акопаў. І толькі ў вачах гаротніка ё штосьці такое, што выдае цяжкую хваробу, і муку, і безнадзейнасць. Вочы ў яго праваліліся, зрабіліся маленькімі. Галоўнае ж, яны страшэнна змарнаваныя, нейкія змятыя, сцёртыя. Трэба прыгледзецца да іх, і тады відаць у іх боль. Дзіўная гісторыя з гэтым нешчаслівым чалавекам выйшла*"... | |
| 9 | У гэтай аповесці М. Гарэцкага Лявон выступае ў новай якасці: пасля завяршэння вучобы ён працуе каморнікам у глухім кутку Віленшчыны. | 1) "На іміперыялістычнай вайне";<br>2) "Меланхолія";<br>3) "Дзве душы";<br>4) "Ціхая плынь". |
| 10 | Вызначце твор М. Гарэцкага па наступнай інфармацыі: "*У гэтым творы выявілася яшчэ адна асаблівасць таленту пісьменніка – імкненне быць дакладным і праўдзівым. Твор стаў такім жа "жывым сведчаннем", "чалавечым дакументам" пра вайну, як і раманы яго сучаснікаў Анры Барбюса "Агонь", Эрыха Марыі Рэмарка "На Заходнім фронце без зменаў", Эрнэста Хемінгуэя "Бывай, зброя!*". | 1) аповесць "Меланхолія";<br>2) раман "Віленскія камунары";<br>3) аповесць "На імперыялістычнай вайне";<br>4) п'еса "Жартаўлівы Пісарэвіч". |

# ЛІТАРАТУРА

## Асноўная

1 Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т.1. (1901–1920) / НАН Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 583 с.

2 Гісторыя беларускай літаратуры (пачатак XX стагоддзя) : электронны навукова-метадычны комплекс для спецыяльнасці 1-21 05 02 Руская філалогія (па напрамках): напрамак спецыяльнасці 1-21 05 02-01 Руская філалогія (Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць), 1-21 05 02-02 Руская філалогія (Камп'ютарнае забеспячэнне) [Электронны рэсурс] / склад. Т. А. Фіцнер. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2023. – 144 с. – Рэжым доступа: http://dot3.gsu.by/course/view. php?id=1378. – Дата доступа: 10.11.2023.

3 Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : электронны навукова-метадычны комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках): напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць) [Электронны рэсурс] / склад. Т. А. Фіцнер ; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2023. – 164 с. – Рэжым доступа: http://elib.gsu.by/handle/123456789/61473. – Дата доступа: 10.11.2023.

4 Гісторыя беларускай літаратуры для спецыяльнасцей 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура Замежная мова (англійская): электронны навукова-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне [Электронны рэсурс] / склад. : Т. У. Ганчарова-Цынкевіч [і інш.]. – Минск : БДПУ імя Максіма Танка, 2016. – Рэжым доступа: https://elib.bspu.by/bitstream/doc/43707/3/Гісторыя%20беларускай%20літаратуры_І.М.%20Гоўзіч%2с%20Т.У.%20Ганчарова-Цынкевіч%2с%20А.У.%20Жардзецкая%2с%20В.І.%20Козіч%2с%20С.А.%20Сычова%2с%20Т.М.%20Тарасава.pdf. – Дата доступа: 10.11.2023.

## Дадатковая

1 Адамовіч, А. "Браму скарбаў сваіх адчыняю" / А. Адамовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 224 с.

2 Баршчэўскі, Л. П Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л. П. Баршчэўскі, П. В. Васючэнка, М. А. Тычына. – Мінск : “Радыёла-плюс”, 2006. – 596 с.

3 Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 387 с.

4 Васючэнка, П. В. Ад тэксту да хранатопа : артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. В. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 200 с.

5 Гніламёдаў, У. В. Янка Купала: жыццё і творчасць / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 238 с.

6 Казбярук, У. М. Светлай волі зычны звон : А. Гарун / У. М. Казбярук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 63 с.

7 Конан, Ул. Святло паэзіі і цені жыцця: лірыка Максіма Багдановіча / Ул. Конан. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 208 с.

8 Коўтун, В. Стала песняй у народзе : нарыс жыцця і творчасці Цёткі / В. Коўтун. – Мінск : Народная асвета, 1998. – 143 с.

9 Максімовіч, В. А. Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку 20 стагоддзя : дапам. для студэнтаў філалаг. фак. ВНУ / В. А. Максімовіч. – Мінск : Аракул, 2000. – 351 с.

10 Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – Мінск. : Навука і тэхніка, 1995. – 144 с.

11 Навуменка, І. Я. Якуб Колас : духоўны воблік героя / І. Я. Навуменка. – 2-е выд., дап. і перапрац. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1981. – 238 с.

12 Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым: проза Максіма Гарэцкага / І. П. Чыгрын. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 232 с.

Вытворча-практычнае выданне

**Фіцнер** Таццяна Адамаўна

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НАШАНІЎСКАГА ПЕРЫЯДУ

Практычны дапаможнік

Рэдактар К. С. Балашова
Карэктар В. У. Калугіна

Падпісана да друку 25.01.2024. Фармат 60x84 1/16.
Папера афсетная. Рызаграфія. Умоўн. друк. арк. 2,79.
Ул.-выд. арк. 3,05. Тыраж 10 экз. Заказ 40.

.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”.
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02330 / 450 ад 18.12.2013 г.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабніка,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў у якасці:
выдаўца друкаваных выданняў № 1/87 ад 18.11.2013 г.;
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 3/1452 ад 17.04.2017 г.
Вул. Савецкая, 104, 246028, Гомель.